# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ
## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 10 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.**

| № п.п. | Пытанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Транскрыпцыя спалучэння слоў *не можа* [н’эмóжа] правільная? | | + |
| 2 | У слове *месцы* вымаўляецца падоўжаны гук? | | + |
| 3 | Словы *на адным* утвараюць адно фанетычнае слова? | + | |
| 4 | У слове *стаяць* колькасць літар і гукаў супадае? | + | |
| 5 | У слове *гібель* адзін гук санорны, два гукі – шумныя звонкія? | + | |
| 6 | У фразе вымаўляецца 8 мяккіх гукаў? | | + |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 2.**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **А** | **4** | **Б** | **1** | **В** | **7** | **Г** | **5** | **Д** | **2** | **Е** | **6** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| *уютный* | ***утульны*** | *очаровательный* | ***чароўны*** |
| *удобный* | ***зручны / выгодны*** | *блестящий* | ***бліскучы*** |
| *ухоженный* | ***дагледжаны*** | *благоуханный* | ***духмяны / пахучы*** |
| *образцовый* | ***узорны*** | *укромный* | ***зацішны / ціхі*** |
| *привлекательный* | ***прывабны*** | *чудесный* | ***цудоўны*** |
| *живописный* | ***маляўнічы*** | *шикарный* | ***шыкоўны*** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***адпакутаваць*** | | | *адпакутуйце* |
| | *гляджу* | ***гледзіце*** | |
| *мыць* | | | ***мыйце*** |
| *заняць* | | ***займеце*** | |
| *зжаць* | ***сажну*** | | |
| | | *спасцігнеце* | ***спасцігніце*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 5.**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Назоўнік, утвораны складана-бяссуфіксным спосабам | ***дымаход*** |
| 2 | 2 вытворныя прыназоўнікі | ***замест, уздоўж*** |
| 3 | Лічэбнік, які змяняецца па родах, ліках і склонах | ***адзін*** |
| 4 | З першага сказа словазлучэнне з сувяззю дапасаванне | ***(для) кожнай мясцовасці*** |
| 5 | Назоўнік, род якога не вызначаецца | ***нары*** |
| 6 | Азначальны займеннік | ***кожнай*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал (нават калі ў адказе прапаноўваюцца 2 ці больш адпаведных пастаўленым умовам слоў). У выпадку спалучэння правільнага і няправільнага варыянтаў адказу – 0 балаў.*

**Заданне 6.**

| № сказа | Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт сказа |
|---|---|---|
| **1** | Памылка звязана з ужываннем формы ступені параўнання прыслоўя. Складаная форма найвышэйшай ступені параўнання ўтвараецца шляхам далучэння да зыходнай формы прыслоўя слоў ***больш (менш)*** | *Серыя магазінаў “М”:* ***больш танна*** *толькі ў нас, прыязджай і купляй!* |
| **2** | Памылка звязана з ужываннем рознаскланяльнага назоўніка: у назоўным склоне павінна быць ***дзіця*** | *Кожнае* ***дзіця*** *мае права на адукацыю!* |
| **3** | Няма памылак | – |
| **4** | Памылка звязана з афармленнем аднародных членаў сказа. Злучнік ***не толькі…, але і*** звязвае аднародныя члены сказа. Значыць, першая частка злучніка (***не толькі…***) павінна стаяць перад першым аднародным членам сказа, а другая частка (***але і…***) – перад другім | *Вам* ***не толькі*** *прадалі дрэнны тавар,* ***але і*** *аказалі няякасную паслугу? Вы можаце дабіцца справядлівасці!* |
| **5** | ***Гарачы кіпень*** – плеаназм | *У сталовай можна папрасіць* ***кіпень.***<br>АБО<br>*У сталовай можна папрасіць* ***гарачую ваду.*** |
| **6** | Памылка звязана з лексічнай неспалучальнасцю слоў у словазлучэнні ***пятнаццаці дзён дэкады***: у дэкадзе 10 дзён | *На працягу першых* ***пятнаццаці дзён*** *(месяца, года) надвор’е не зменіцца.* |

*За кожны правільна запоўнены радок (у тым ліку за сцвярджэнне адсутнасці памылкі) – 1 бал (0,5 бала за выяўленне і 0,5 бала за тлумачэнне памылкі).*

**Заданне 7.**

Падтрыманне *(утрыманне, трыманне)* тэрыторыі ў зімовы *(зімні)* перыяд уключае расчыстку ад снегу і наледзі праезнай часткі і пешаходных дарожак *(ходнікаў)*, вываз снегу і наледзі на ўзгодненыя ва ўстаноўленым парадку пляцоўкі складзіравання снегу і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з абавязковымі для выканання патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў у частцы эксплуатацыйнага стану, дапушчальнага па ўмовах забеспячэння бяспекі дарожнага руху.

*За кожную памылку перакладу (лексічную або граматычную) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, за кожную памылку ў афармленні (арфаграфічную або пунктуацыйную) – 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| **Лакацыя** | **Лішні аб’ект (лішнія аб’екты)** | **Тлумачэнне выбару** |
|---|---|---|
| алея Мастацкіх напрамкаў | Скульптурная кампазіцыя “Сярэднявечча” | Гэта гісторыка-культурная эпоха, а не літаратурны напрамак |
| парк Тропаў | Альтанка санета | Гэта цвёрдая форма верша, а не троп / жанр |
| сквер Эпасу | Клумба балады | Гэта жанр ліра-эпасу, а не эпасу |
| сад “Формы вершаў” | Фантан “Вадэвіль” | Гэта драматургічны жанр, а не форма верша |

*За кожнае правільнае вызначэнне аб’екта – 0,5 бала, за кожнае прынцыпова правільнае тлумачэнне – 1 бал.*

**Заданне 9.**

| **Нумар прыпынку** | **Імем якога пісьменніка названы прыпынак** | **З якога твора цытата** |
|---|---|---|
| 1 | **Ян Баршчэўскі** | **“Плачка”** |
| 2 | **Максім Гарэцкі** | **“Роднае карэнне”** |
| 3 | **Якуб Колас** | **“Новая зямля”** |
| 4 | **Кузьма Чорны** | **“На пыльнай дарозе”** |

*За кожнае правільнае вызначэнне пісьменніка – 0,5 бала, за кожнае правільнае вызначэнне твора – 1 бал.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка задання складаецца з чатырох кампанентаў: ведання імя пісьменніка і яго твораў; ацэнкі афармлення гарадскіх аб’ектаў; ацэнкі прапанаванага праекта; ацэнкі цытат і тлумачэння да іх.*

*Веданне імя пісьменніка і яго твораў*

| | |
|---|---|
| Названы Янка Купала і прапанаваны адзін з яго твораў | 1 бал |
| Названы Янка Купала, але твор названы няправільна | 0,5 бала |
| Названы іншы пісьменнік або пісьменнік не названы | 0 балаў |

*Ацэнка афармлення гарадскіх аб'ектаў*

| | |
|---|---|
| Апісаны два прынцыпова розныя аб'екты афармлення, прапанавана іх прынцыпова рознае афармленне, якое звязана з творам, дадзена лагічнае тлумачэнне, як ідэя двух аб'ектаў афармлення звязана з ідэяй выбранага твора | 2 балы |
| Тыя ж патрабаванні, што і на 2 балы, але дадзена адно лагічнае тлумачэнне, як ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага твора (другое тлумачэнне нелагічнае або адсутнічае) | 1,5 бала |
| Тыя ж патрабаванні, што і на 2 балы, але дадзена два нелагічныя тлумачэнні, як ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага твора або тлумачэнні адсутнічаюць<br>АБО<br>Апісаны адзін аб'ект афармлення, прапанавана яго афармленне, якое звязана з творам, дадзена лагічнае тлумачэнне, як ідэя афармлення аб'екта звязана з ідэяй выбранага твора<br>АБО<br>Апісаны два блізкія аб'екты (напрыклад, два будынкі) афармлення, прапанавана іх прынцыпова рознае афармленне, якое звязана з творам, дадзена лагічнае тлумачэнне, як ідэя двух аб'ектаў афармлення звязана з ідэяй выбранага твора | 1 бал |
| Апісаны адзін аб'ект афармлення, прапанавана яго афармленне, якое звязана з творам, дадзена нелагічнае тлумачэнне, як ідэя афармлення аб'екта звязана з ідэяй выбранага твора або тлумачэнне адсутнічае<br>АБО<br>Апісаны два блізкія аб'екты (напрыклад, два будынкі) афармлення, прапанавана іх прынцыпова рознае афармленне, якое звязана з творам, дадзена нелагічнае тлумачэнне, як ідэя двух аб'ектаў афармлення звязана з ідэяй выбранага твора або тлумачэнне адсутнічае | 0,5 бала |
| Не выканана ні адна з умоў задання або адказ адсутнічае | 0 балаў |

*Ацэнка прапанаванага праекта*

| | |
|---|---|
| Прапанавана апісанне, як праект зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі ў сувязі з выбраным творам. Для апісання праекта выкарыстана не больш за 100 слоў | 1 бал |
| Прапанаваная ідэя афармлення гарадской прасторы звязана з вызначаным творам, але няма апісання, як гэта зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі, і / або для апісання праекта выкарыстана больш за 100 слоў<br>АБО | 0,5 бала |

| | |
|---|---|
| Прапанавана апісанне, як ідэя афармлення зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі, але яна не звязана з вызначаным творам і / або для апісання праекта выкарыстана больш за 100 слоў | |
| Прапанаваная ідэя афармлення гарадской прасторы не звязана з вызначаным творам, няма апісання, як праект зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі | 0 балаў |

*Прапанаваныя цытаты:*

| | |
|---|---|
| Прапанавана правільная цытата, дадзена лагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата | 1 бал за кожную цытату |
| У цытаце маюцца нязначныя фактычныя памылкі (перастаўлены словы, заменена ці апушчана слова і падобнае), дадзена лагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата<br>АБО<br>Прапанавана правільная цытата, але дадзена нелагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата, або тлумачэнне адсутнічае | 0,5 бала за кожную цытату |
| У цытаце маюцца нязначныя фактычныя памылкі (перастаўлены словы, заменена ці апушчана слова і падобнае), дадзена нелагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата, або тлумачэнне адсутнічае<br>АБО<br>Адказ адсутнічае | 0 балаў за кожную цытату |